ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
17
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 10 (1386)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НАВУКОВЫ КАЛЁКВІУМ

на тэму «Міжнародныя сувязі ў Сярэдневяковай Еўропе» закончыў сваю работу ва універсітэце. У ім прынялі ўдзел вучоныя Масквы, Ленінграда, Свярдлоўска, Мінска, Магілёва і іншых гарадоў краіны.

**Н. ГУСАКОВА,**
загадчыца кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

### АДКАЗНЫ КАНЦЭРТ

на пацвярджэнне звання «народнай» дала на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе калектываў мастацкай самадзейнасці харавая капэла універсітэта пад кіраўніцтвам І. Г. Мацюхова.

**У. МАКАРЭВІЧ,**
дырэктар студэнцкага клуба.

### ПРАБЛЕМЫ

падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для замежных краін абмяркоўваліся на агульным сходзе замежных аспірантаў. Прарэктар па навуковай рабоце дацэнт І. П. Зяцькоў расказаў аб асаблівасцях вучобы ў аспірантуры і асноўных патрабаваннях, што прад'яўляюцца да аспірантаў. З новымі палажэннямі аб тэрмінах знаходжання замежных грамадзян у аспірантуры азнаёміў прысутных прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа.

**У. БУДАЙ,**
кіраўнік інтэрпрэсцэнтра.

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

адбылася на пасяджэнні гуртка крытыкі студэнцкага навуковага таварыства факультэта журналістыкі. У госці прыйшлі нядаўнія выпускнікі журфака—карэспандэнт «Чырвонай змены» Ігар Аўдзееў і загадчыца аддзела штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» Таццяна Мушынская. Госці расказалі аб праблемах сучаснага рэцэнзавання, падзяліліся творчымі планамі.

**І. ЗЫБАЙЛА,**
студэнт факультэта журналістыкі.

### ПЕРШЫНСТВО

па класічнай барацьбе ў праграме VIII Спартакіяды БССР прайшло ў Віцебску. Бліскучай перамогі дабіўся слухач падрыхтоўчага аддзялення БДУ імя У. І. Леніна Камандар Маджыдаў. Ён правёў пяць паядынкаў і ва ўсіх быў мацнейшым.

Выдатна выступілі і студэнты геаграфічнага факультэта Вадзім Коржаль і Алег Хранека, якія занялі два другія месцы.

**С. МАКАРЭВІЧ,**
загадчык кафедры фізвыхавання і спорту.



## ● НАВУКА — ВЫТВОРЧАСЦІ

*ЛАБАРАТОРЫЯ экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў існуе з першага дня стварэння НДІ ФХП. Кіруе ёю член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры аналітычнай хіміі Рыгор Лазаравіч Старобінец. Тэма навуковых даследаванняў лабараторыі — экстракцыйныя метады выдзялення і ачысткі рэчываў. Тут распрацоўваюць працэсы атрымання рэчываў вельмі высокай чыстаты. Існуючыя ў даны момант прамысловыя метады больш складаныя, энерга- і працаёмкія. Вынікі даследаванняў вучоных выкарыстоўваюцца ў мэтах кантролю акружаючага асяроддзя, для аналізу рэдкіх хімічных элементаў.*

*Лабараторыя навуковая, але прымае актыўны ўдзел у навучальным працэсе. Студэнты кафедры аналітычнай хіміі пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў лабараторыі рыхтуюць дыпломныя работы, удзельнічаюць у навуковых даследаваннях, у рабоце навуковага гуртка. Дарэчы, супрацоўнікі лабараторыі — у асноўным выпускнікі хімфака, лабаранты — студэнты-вячэрнікі. Сярод супрацоўнікаў — два кандыдаты навук, 5 чалавек працуюць над дысертацыямі. Гэта даследаванні ў новых галінах хімічнай навукі, вынікі якіх таксама будуць выкарыстаны ў прамысловасці.*

*НА ЗДЫМКУ: дослед праводзіць старшы навуковы супрацоўнік кандыдат хімічных навук У. У. ЯГОРАЎ.*

*В. ШАЧАК.*
*Фота аўтара.*

## «Хачу быць камсоргам!»

**Ці здаралася вам сустракацца з камсоргам па ўласнай ініцыятыве! Як гэта! А вось так: сам чалавек захацеў весці камсамольскую работу. Калі такое было ў вашым жыцці, то мне проста зайздросна, бо самой толькі зараз пашчасціла пазнаёміцца з камсоргам Людмілай Манішкінай. Люда, бадай, самая яркая асоба з усіх тых, пра каго мне даводзілася пісаць. Яе адметнасць — у нейкай душэўнай незаспакоенасці, задоры, жыццядзейнасці.**

Зацікаўленыя, здзіўленыя позіркі. Група прыціхла. Можа, пачулася? Не, упэўнены голас паўтарыў тое ж. «Хочаш, то будзь ім», — угору дружна падняліся рукі.

Гэта быў шосты дзень навага навучальнага года, шосты дзень існавання 3-й групы 1-га курса механіка-матэматычнага факультэта.

**Марына ВЯРЭТНІКАВА: Спачатку я вельмі насцярожана аднеслася да нашага камсорга. Каб хтосьці ўстаў ды сам прапанаваў уласную кандыдатуру —для мяне такое было ўпершыню. Тады мы ледзь толькі паспелі пазнаёміцца, нават імён адзін аднаго добра не ведалі.**

А праз некалькі дзён пачалася самая запамінальная, першая «бульба». Яна, па агульнаму меркаванню, мае зусім не другарадную ролю пры фарміраванні калектыву групы.

**Людміла МАНІШКІНА, камсорг 3-й групы: Мне не давялося восенню працаваць разам з сябрамі. І калі зноў мы сабраліся на факультэце, я некалькі разгубілася. Рабяты нешта прыпаміналі, абмяркоўвалі, смяяліся. Я ж не ведала, чым жылі яны цэлы месяц, і адчувала сябе, як палкаводзец без войска.**

Вагацца і чакаць не было калі. Група жыла, і патрэбна было накіроўваць бурлівую дзейнасць калектыву ў адзінае рэчышча. Людзе дапамог даволі багаты вопыт камсамольскай работы ў школе і на прадпрыемстве. «Дзейнічаць і яшчэ раз дзейнічаць, — вырашыла для сябе дзяўчына, — каб хутчэй уліцца ў асяроддзе аднадумцаў, падняцца на капітанскі масцік таго карабля, што адплыў, на жаль, без мяне».

**Таццяна САСКАВЕЦ: Камсорг прапанавала правесці некалькі мерапрыемстваў. Палітінфармацыі, камсамольскія сходы... Адразу ж падумалася: зноў шаблон, зноў нікому не патрэбнае гадзіннае чытанне даклада, затым яго абмеркаванне загадзя прызначанымі людзьмі, як у школе...**

**Марына ВЯРЭТНІКАВА: Мы былі вельмі здзіўлены тым, што Люда патрабавала адказных адносін да кожнага, нават нязначнага мерапрыемства. Калі палітінфармацыя, то тэматычная, з падборам цікавых матэрыялаў, каб усіх яны захапілі і прымусілі выказаць свае меркаванні. Пра камсамольскія сходы асобны сказ. Яны сталі для нас сур'ёзнымі размовамі, а іх рашэнні — кірункам далейшай работы. Асабліва мне запомніўся сход напярэдадні зімовай сесіі. Мы запрасілі старшакурсніцу, і яна расказала шмат цікавага і крышку таямнічага з жыцця студэнцтва ў гэты самы адказны момант.**

**Валерый ЖДАНОВІЧ: Аднойчы Люда прапанавала арганізаваць сустрэчу са студэнтамі політэхнічнага інстытута. Усю групу захапіла гэтая справа. Бегалі, мітусіліся, рыхтавалі самадзейнасць, афармлялі залу ў інтэрнаце. Сустрэча прайшла цікава, яна мне спадабалася і запомнілася.**

Мінула толькі паўгода, трэцяя група здала сваю першую сесію, і нядрэнна здала. Умела спалучаюць тут вучобу з грамадскай актыўнасцю. Прапановы сыплюцца адна за другой, І камсамольскае бюро, абмяркоўваючы іх, звычайна засядае больш за дзве гадзіны (гэта пры перыядычнасці 2 разы ў месяц), і спрачаюцца яго члены... А ў спрэчцы нараджаецца ісціна. Ісціна для гэтых рабят— у іх згуртаванасці, у наяўнасці здаровага калектыву.

**Людміла МАНІШКІНА: Мне здаецца, калектыў склаўся на «бульбе».**

**Таццяна САСКАВЕЦ: Калектыў нарадзіўся ўжо ў час вучобы. Нас аб'ядналі агульныя справы, мерапрыемствы. У гэтым вялікая заслуга нашага камсорга. Людзе ўласціва ўменне арганізаваць людзей, кіраваць імі. Не ўяўляю кагосьці іншага камсоргам. Толькі Люда можа весці гэту складаную і адказную, такую цікавую, разнастайную работу.**

**Валерый ЖДАНОВІЧ: Наша Люда — баявы, ініцыятыўны кіраўнік. Яна прынцыповая і бескампрамісная. Работу камсорга ацэньваю толькі на выдатна.**

Выдатны камсорг. Ён не працуе за ўсіх, не толькі сам прапаноўвае і арганізоўвае. Ён так ставіць справу, што кожны член калектыву нешта робіць для ўсіх.

**Людміла МАНІШКІНА: Мне вельмі пашанцавала. Такія актыўныя рабяты ў групе, што, бывае, губляешся перад малаверагоднасцю ажыццяўлення іх задум. А колькі цікавага і карыснага чакае нас наперадзе. Хутка адкрыем літаратурны клуб аматараў паэзіі. Хай паспрабуе тады хто назваць матэматыкаў сухарамі! А ў маі збіраемся зрабіць экскурсію па ваколіцах Мінска, пазнаёміцца з гарадамі Беларусі.**

Гэта самыя маштабныя і прыкладныя штрыхі далейшай дзейнасці калектыву. Нямала новых прапаноў паступіць яшчэ для разгляду на наступных пасяджэннях камсамольскага бюро. Можа, рабяты ў гэты час ужо захоплены якойсьці ідэяй. І таму кожны вечар не гасне святло ў пакоі 1013 «б» сёмага інтэрната. «Баявы штаб» 3-й групы на чале з гаспадыняй пакоя Людай Манішкінай распрацоўвае праграму дзеянняў. І хутка, вельмі хутка новая прапанова стане яшчэ адным запамінальным словам у такой цікавай і багатай кнізе — кнізе летапісу добрых спраў 3-й групы.

Каму ж тут пашанцавала: Людзе Манішкінай ці яе сябрам? Напэўна, пашанцавала групе, усёй адразу. Таму што рабяты згуртаваліся ў адзіны калектыў. А каб пачуццё еднасці і дружбы расло, патрэбна ўменне кіраваць групай. Так перш за ўсё ацэньваюць камсамольцы работу свайго камсорга. «Наша Людка» — гэта зачынальнік, нястомны ініцыятар, умелы і вопытны арганізатар. Без упэўненасці, задору, пранікнёнасці Люды нельга ўявіць жыццё яе сяброў. І ні ў каго зараз не выклікае асцярэчання «пасада» Людмілы Манішкінай.

— Я хачу быць камсоргам!..

Цяпер можна было б з упэўненасцю дадаць:

— Я магу быць камсоргам і ведаю, што ў мяне атрымаецца.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

*Завяршаем дыскусію:* **ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ**

# Калі непакоіць спакой

**КОЛЬКІ ЛЮДЗЕЙ — столькі думак. Ісціна гэта яшчэ раз пацвердзілася ў ходзе газетнай дыскусіі, дзе мы мелі магчымасць азнаёміцца з меркаваннямі самых розных прадстаўнікоў студэнцтва, выслухаць разнастайныя — часам палярныя — разважанні, атрымаць цікавыя, і зноў-такі неаднародныя пісьмы: ад лагодных да «калючых». Здаецца, усе пункты гледжання акрэслены, усе кропкі над «і» расстаўлены. Большасць нашых карэспандэнтаў схіляюцца да думкі, што актыўная жыццёвая пазіцыя — неабходны і немалаважны элемент чалавечай (не толькі студэнцкай) дзейнасці. Але адна справа разважаць аб актыўнасці, другая — жыць па яе законах. Таму не выпадкова, што яшчэ адна рубрыка, якая ў апошні час нярэдка ўзнікала на газетных старонках, урэшце таксама вылілася ў размову аб актыўнай жыццёвай пазіцыі. «Быць на передавой. Што гэта значыць?» На такую тэму разважалі студэнты, вызначаючы, дзе яна, передавая 80-х. І зразумелі — у штодзённай справе, у асабістых адносінах да яе. Так заканамерна аб'ядналіся тэмы дзвюх дыскусій, яны сталі падставай для размовы пра сучаснага чалавека, студэнта, пра яго месца і ролю ў грамадскім жыцці. Ад праблем бытавых, часта знешніх і дробных, рабяты перайшлі да абмеркавання істотных цяжкасцей, справядліва вырашыўшы, што іменна дыскусія, жывая, зацікаўленая гутарка дапаможа зразумець напрамак і шляхі пераадолення недахопаў. Спрабавалі аналізаваць прычыны пасіўнасці пэўнай часткі студэнцтва. Няхай не заўсёды кваліфікавана і паслядоўна (з аднаго боку прызнаюцца: «Самі вінаваты», з другога — патрабуюць пакінуць іх у спакоі), але шчыра, з сапраўдным жаданнем разабрацца ў сітуацыі.**

**Сярод правільных, але чакаемых водгукаў, якія можна было прадбачыць, былі і нечаканыя, задзірыстыя, вострапалемічныя, па-юнацку максімалісцкія, не ва ўсім справядлівыя. Іх паяўленне выклікала новую хвалю думак, разважанняў, дало магчымасць выпрабаваць сябе на ўменне адстаяць уласны пункт гледжання, пераканаць свайго апанента. Не будзе перабольшаннем, калі скажам, што ў ходзе газетнай дыскусіі многія са студэнтаў, актыўна ў ёй удзельнічаўшыя, набылі пэўныя навыкі ідэалагічнай работы, больш акрэслена ўявілі ўласную ролю ў грамадскім жыцці.**

**Каб падвесці вынікі дыскусіі «Твая актыўная жыццёвая пазіцыя», абагульніць усё сказанае раней, наш карэспандэнт Н. КАЛІШЭВІЧ звярнулася да загадчыка аддзела праблем студэнцкай моладзі навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў, кандыдата філасофскіх навук Уладзіміра Аляксандравіча ДУНАЕВА з просьбай адказаць на некаторыя пытанні.**

**— Уладзімір Аляксандравіч, праблемамі фарміравання грамадска-палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі ваш аддзел займаецца з сярэдзіны 70-х гадоў, рыхтуецца да друку кніга, прысвечаная гэтай тэме, дзе, дарэчы, ёсць такія словы: «Прынцыповым і ключавым палажэннем ленінскай праграмы палітычнага выхавання савецкага студэнцтва стаў прынцып актыўных, самастойных адносін да рэчаіснасці. «Без поўнай самастойнасці, — падкрэсліваў У. І. Ленін, — моладзь не здолее ні выпрацаваць з сябе добрых спецыялістаў, ні падрыхтавацца да таго, каб весці сацыялізм наперад». Згадзіцеся, што пазіцыя студэнта Н. К., які даслаў у рэдакцыю пісьмо-пытанне «Навошта мне гэта патрэбна?», цалкам самастойная і па-свойму актыўная?..**



*Трэба актыўней уздзейнічаць на нефармальнага лідэра*

— Іменна так, і давайце паспрабуем адысці ад нейкай зададзенасці, каб не стаць такімі ж Н. К., толькі са знакам «плюс», маўляў, ён нас агулам абвінавачвае, адкажам тым жа. Лепш, пазбегнуўшы ўзаемных абвінавачванняў, разабрацца: а ў чым яго пазіцыя справядлівая? Тым больш, што ў яго пісьме ёсць па меншай меры тры найсур'ёзнейшыя пытанні.

Па-першае. Аб «дзейнасці, накіраванай у нікуды». Не трэба адразу кідацца мянушкамі «дэмагог», «актыўны песіміст» і іншымі. Магчыма, ён не ва ўсім памыляецца і мае падставу так гаварыць, асабліва калі вучыцца на старэйшых курсах. Нашы даследаванні адзначылі некаторае зніжэнне актыўнасці старшакурснікаў. І гэта можна растлумачыць: ідзе разлад паміж будучымі прафесійнымі функцыямі і грамадскай работай, ставяцца мэты, якія ўжо не цікавяць, часцей за ўсё не новыя і не патрэбныя.

Па-другое. Я думаю, што Н. К. патрэбна не водпаведзь, а дапамога. Справа ў тым, што ён згубіў сэнс сваёй уласнай дзейнасці, разгубіўся ў моры шматлікіх, дробных і, на першы погляд, не звязаных паміж сабой абавязацельстваў. Такое здараецца і ўзнімае сур'ёзныя, у тым ліку маральныя, праблемы. Напрыклад, мараль і навука. Сённяшні вучоны займаецца асобнай навуковай праблемай, агульная карціна даследаванняў яму не заўсёды дакладна ўяўляецца, а гэта значыць, што ёсць небяспека ў якійсьці момант страціць ці знізіць адказнасць (і маральную) за сваю дзейнасць. Таксама — вытворчасць і экалогія. Праблема забруднення навакольнага асяроддзя стала інтэрнацыянальным болем. Маштабы вытворчасці, грандыёзнасць планаў, як гэта ні парадаксальна, замыкаюць чалавека ў рамкі, праз якія цяжка разгледзець вынікі бяздумных адносін да свайго ж месца існавання. Няўменне (ці нежаданне) убачыць палажэнне ў цэлым прыводзіць да таго, што чалавецтва падсякае сук, на якім сядзіць.

Універсітэт рыхтуе і вучоных, і кіраўнікоў вытворчасці, маральныя якасці якіх грамадству не абыякавыя. Як бачыце, усё гэта больш сур'ёзна, чым здавалася на першы погляд, таму яшчэ раз скажу: Н. К. трэба дапамагчы аднавіць адчуванне цэласнасці сэнсу яго дзейнасці. А гэта і ёсць тая самая нешаблонная работа, пра якую мараць многія актывісты. Толькі папярэджу, што справа гэта вельмі тонкая і рабіць яе трэба тактоўна, без перагібаў і «лабавых атак».

І па-трэцяе. Аб выхаванні. Пытанне ў тым, што пад гэтым разумець. Калі заўсёдныя прыдзіркі куратара, якому на выхаванне часу няма, а на заўвагу ў перапынку хапае, дык я таксама супраць. Але ёсць і іншае выхаванне, ухіляцца ад якога шкодна ў першую чаргу самому Н. К. Гэта выхаванне студэнта як будучага кіраўніка. Па рэзультатах нашых апытанняў да 60 працэнтаў студэнтаў скардзяцца на адсутнасць у іх ар-



*Паняцце актыўнасці не павінна разглядацца як актыўнасць асобнага чалавека*

ганізацыйных навыкаў, патрэбных для прафесійнай дзейнасці. Вось што трэба выхоўваць.

**— Дарэчы, як?**

— Шляхам удасканалення сістэмы грамадскай работы, перш за ўсё пераарыентацыяй на месца будучай прафесійнай дзейнасці студэнта. Напрыклад, сувязь са школамі, работа ў клубах тэхнічнай творчасці, удзел у конкурсах на лепшы дыпломны, курсавы праект па тэматыцы прадпрыемства. Мы прапануем уключаць такія формы работы ў заданні па ГПП.

**— Жыццёвая пазіцыя чалавека вызначае і яго прафесійнае аблічча. З гэтым нельга не згадзіцца. Але выпрацоўваецца і замацоўваецца гэтая пазіцыя перш за ўсё ў пярвічным студэнцкім калектыве — акадэмічнай групе. І тут, як гэта ні дзіўна, думкі студэнтаў аднадушныя — групы ў асноўным пасіўныя, абставіны складаныя...**

— Што датычыць псіхалагічнага клімату групы, дык гэта асобная тэма, і я не буду яе кранаць. Тут, як хвораму, нельга даць завочных рэкамендацый, трэба ведаць канкрэтныя абставіны. А вось наконт актыўнасці некалькі слоў скажу. Галоўнае, што лічыць мерай і формай праяўлення актыўнасці. У нашых даследаваннях мы карысталіся наступнымі параметрамі: фактар удзелу, затраты часу, адносіны да грамадскай работы. Гэта ў тэорыі. А на практыцы вялікая колькасць нюансаў. Ці лічыць актыўным, напрыклад, чалавека, які, не праяўляючы ўласнай ініцыятывы, у той жа час добрасумленна выконвае даручанае? На маю думку, лічыць. Паняцце актыўнасці не павінна разглядацца як актыўнасць асобнага чалавека. Формы сумеснай дзейнасці прадвызначаюць заканамернае і непазбежнае размеркаванне функцый. Не можа група складацца з адных лідэраў, як не бывае груп з адных «ціхонь». Жыць толькі ініцыятывамі, толькі навацыямі немагчыма, адначасова патрабуецца захаванне традыцый і пачуцця адказнасці. Гэтага, дарэчы, часта не ўлічваюць ці проста не ведаюць тыя, хто лічыць сябе актывістам.

**— Часта даводзіцца чуць: дзіўная група, кожны паасобку —цудоўны чалавек, а ўсе разам —«дрыгва».**

— У даным выпадку трэба гаварыць пра нізкую калектыўную актыўнасць студэнцкай групы. Увогуле, гэта з'ява натуральная. Тут назіраецца некаторы разрыў паміж тэорыяй і практыкай. Тое, што студэнты добра ведаюць тэарэтычна, не заўсёды замацоўваецца на практыцы. Часта атрымліваецца, што арыентацыя асобных студэнтаў больш станоўчая, чым калектыву ўвогуле. Студэнцкая група з выпрацаванымі ёю усераднёнымі каштоўнасцямі на жыццёвым узроўні блакіруе перадачу агульных задач, атрыманых у ходзе вывучэння грамадскіх дысцыплін. Больш свядомыя прадстаўнікі групы часта проста не жадаюць ісці на канфлікты ў дробязях, ахоўваюць уласныя камфортныя псіхалагічныя ўмовы. Усё гэта можа прывесці да таго, што групавая норма прыйдзе ўразрэз з маральнай, але трэба ўлічваць, што група — гэта структура, якую нельга ігнараваць. Для таго, каб пазбавіць яе ад «захворвання», стварыць тое, што завецца калектывам, трэба ўдзяляць увагу ўдасканаленню групавой структуры, выкарыстоўваць гібкія формы індывідуальнай работы з нефармальнымі лідэрамі.

**— Калі можна, падрабязней пра фармальных і нефармальных лідэраў.**

— Фармальныя лідэры — тыя, хто афіцыйна кіруе калектывам. Да думак, учынкаў, дзейнасці нефармальных лідэраў прыслухоўваецца асноўная частка таго ж калектыву, нефармальны лідэр — аўтарытэт у сваім асяроддзі. Гэтыя сацыяльныя ролі нярэдка выконваюць розныя людзі. Супадзенне афіцыяльнага і неафіцыяльнага лідэрства ў адной асобе было б ідэальным сродкам ад большасці непаразуменняў. Аднак паколькі ідэальныя мадэлі ў жыцці сустракаюцца нячаста, а бязвыхадных становішчаў быць не павінна, ёсць «запасны» варыянт: планамернае, разумна распрацаванае ўздзеянне на нефармальнага лідэра. Зараз многа гавораць пра індывідуальную работу са студэнтамі. Пры існуючай колькасці навучэнцаў практычна ажыццявіць гэта пакуль што даволі складана, таму куратарам ёсць сэнс прыслухацца да нашых рэкамендацый: пачынаць і праводзіць індывідуальную работу трэба перш за ўсё з нефармальным лідэрам групы, ад якога ў многім залежаць мікраклімат і сістэма каштоўнасцей данага калектыву; імкніцеся далучыць яго да грамадскай работы, таму што паслядоўны і свядомы выбар маральных каштоўнасцей сацыялізму немагчымы без актыўнай грамадскай дзейнасці. Усе гэтыя мерапрыемствы, нешаблонна праведзеныя, дапамогуць узняць калектыўную актыўнасць студэнцкай групы, практычна падтрымаць веды, атрыманыя ў час вывучэння грамадскіх дысцыплін, бо, як пісаў У. І. Ленін, «простае, кніжнае засваенне таго, што гаворыцца ў кнігах пра камунізм, было б у вышэйшай ступені няправільным. Толькі тады, калі вы навучыцеся самастойна разбірацца па гэтаму пытанню, толькі тады вы здолееце лічыць сябе дастаткова цвёрдым у сваіх перакананнях і дастат-



*Арыентацыя асобных студэнтаў больш станоўчая, чым калектыву ўвогуле*

кова паспяхова адстойваць іх перад кім хочаш і калі хочаш».

**— Думка дакладная і не страціўшая сваёй актуальнасці. Але Вы самі заўважылі, што адказы на многія пытанні з пісьма Н. К. гучаць не надта пераканаўча. Студэнты, нават камсамольскія работнікі ці не здолелі канчаткова разабрацца ў сітуацыі, ці проста абмежаваліся агульнымі фразамі. Чаму так?**

— У многім тут вінавата сама пазіцыя актывістаў-прафесіяналаў. Іх дзейнасць часта зводзіцца толькі да вытворчасці паказчыкаў, якія перашкаджаюць сапраўднаму бачанню свету. Словы Н. К. аб «папяровай завірусе» маюць пад сабой пэўную аснову, таму сённяшні актывіст павінен адносіцца да сваёй справы з павышанай адказнасцю.

Пара ўжо зразумець, што патрэбны іншыя формы работы. На штампах даёка не даедзеш. Увогуле, значэнне, закладзенае у тым, што мы называем «штампам», вялікае, але асэнсоўваць яго не хочацца, прывычнае робіцца банальным. А банальнае, у сваю чаргу, праходзіць міма свядомасці. Трэба вучыцца прыстасоўвацца да складаных сітуацый, умець своечасова прыкмячаць новае —і добрае, і дрэннае, не ленавацца дэталёва прадумваць спосаб падачы традыцыйных мерапрыемстваў, не шкадаваць часу на «асвяжэнне» шматлікіх штампаў. Прыхільнасць да ўстарэўшых метадаў ідэалагічнай работы прыводзіць да яе кансервацыі замест інтэрпрэтацыі, што часцей за ўсё цягне за сабой нежаданне прымаць у ёй удзел, аўтаматычную неўспрымальнасць любых форм грамадска-палітычнай дзейнасці. А гэта ўжо небяспечна.

Трэба не толькі вучыць іншых, але і пастаянна вучыцца самім. Толькі ў такім выпадку выпрацуецца ўменне кваліфікавана весці ідэалагічныя спрэчкі, паявяцца пераканаўчыя аргументы, узятыя не са старонак папулярных брашур і падмацаваныя не аднымі толькі эмоцыямі, а ўласнай практычнай дзейнасцю.

НЯМА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ спаборніцтваў больш цікавых, чым першынство па лыжных гонках.



# ШТО ЧАКАЦЬ АД НЕЧАКАНАСЦЕЙ?

Першая нечаканасць, што сустрэла лыжнікаў, — надвор'е. Амаль усю зіму яно не спрыяла спартсменам. Усе хвалявaліся, якое яно будзе ў першыя два дні вясны, калі будуць праводзіцца старты. Але ў Дзень лыжніка — 27 лютага — марозік даў знаць аб сабе. А першага сакавіка выдаўся цудоўны зімовы дзень. Сонца ярка свяціла над лесам, крапчаў мароз. Гэта прыдавала ўсім, хто сабраўся ў Зялёным, дзе праводзілася першынство, цудоўны настрой.

Другая нечаканасць. Справа ў тым, што для старшынь спортбюро і адказных за факультэты выкладчыкаў кафедры фізвыхавання і спорту спаборніцтвы пачаліся за тыдзень да стартаў. Заяўкі ад каманд павінны быць завераны ўрачом. Але той захварэў, і цэлы тыдзень людзі хадзілі ў паліклініку, псавалі сабе нервы, але без поспеху. І толькі ў самы апошні дзень замест захварэўшага працаваў другі ўрач. Няўжо нельга было такое зрабіць раней? Можна! Аднак — славутая безадказнасць да сваіх прамых абавязкаў. Гэта работнікі паліклінікі пацвердзілі і ў дзень стартаў. Іх папярэдзілі аб часе правядзення спаборніцтваў, але медыцынскага персаналу там ніхто не бачыў. Ці ў лесе яны заблудзіліся, ці не даехалі, не ведаю. Але што траўм хапіла — дык гэта так. Лыжнікам рабілі перавязкі іх сябры. Дзе ж вы, дактары, якія ў любую хвіліну павінны прыйсці на дапамогу?

Лыжнікаў не засмуцілі гэтыя «дробязі». Яны смела ўступалі ў барацьбу з лыжнёй, якая сустрэла крутымі спускамі і зацяжнымі пад'ёмамі. Дзяўчатам трэба было прабегчы пяць кіламетраў, а хлопцам — дзесяць.

Ва універсітэце ў розных відах спорту ёсць свае лідэры. У лыжах такімі з'яўляюцца факультэты прыкладной матэматыкі і гістарычны. Ужо некалькі гадоў аспрэчваюць яны паміж сабой першыя месцы. І калі ў хлопцаў мацнейшыя матэматыкі, то ў дзяўчат — гісторыкі.

У дзяўчат, здавалася, усё зразумела. Першае месца амаль аднагалосна аддавалася Святлане Сяргеевай (гістфак). Другой называлі Алену Данільчанка (журфак), трэцяй — Тарэзу Пашкевіч (гістфак). Уся цікавасць спорту ў тым, што ў ім — нечаканасці.

Але пачнём па парадку. Данільчанка стартавала другой, Пашкевіч — дваццаць чацвёртай, Сяргеева — дваццаць сёмай. Ужо з першых метраў Лена прапанавала саперніцам высокі тэмп. Яна першай заканчвае палову дыстанцыі, Пашкевіч прайграе ёй каля мінуты, Сяргеева ўступіць нават Тарэзе. Чаму? Святлана прыехала з Раўбіч, дзе ўдзельнічала ў Спартакіядзе БССР, і стомленасць адыграла сваю ролю. Ды яшчэ суддзі на трасе дапусцілі няўважлівасць — нясвоечасова паказалі спартсменцы правільную лыжню. Сяргеева паказала толькі трэці вынік. А перамогу аспрэчвалі паміж сабой Данільчанка і Пашкевіч. Будучая журналістка не дазволіла сяброўцы па універсітэцкай зборнай абысці сябе і пасля фінішу святкавала перамогу. Гэтая тройка мела значны адрыў ад астатніх лыжніц.

У хлопцаў лідэрам заставаўся мінулагодні чэмпіён універсітэта студэнт ФПМ Віктар Баранскі. Ён і на гэты раз пацвердзіў сваё майстэрства.

Цяжкая траса пакаралася мацнейшым. Для таго, каб яе прайсці, патрэбна была адвага, асабліва для тых, хто не часта бываў у Зялёным. Па дыстанцыі ляжала нямала паламаных лыж. Многія не закончылі дыстанцыю.

Добра прайшоў 10 кіламетраў Валерый Тутаў (фізфак) і заняў другое месца. Трэцім быў студэнт ФПМ Аляксандр Кавальчук. Пасля гэтага ніхто не сумняваўся, што каманда ФПМ зноў зойме першае месца.

Парадавалі лыжнікі факультэта радыёфізікі і электронікі. Хоць прызавых месц яны і не занялі, але заліковых ачкоў набралі многа.

У эстафеце поспех гарантуе толькі роўны падбор моцных лыжнікаў. У мінулым годзе дзяўчаты гістарычнага факультэта былі на галаву вышэй за саперніц. З таго саставу засталася толькі Тарэза Пашкевіч. Каманда гістфака сёлета выступала няроўна. Але дзякуючы Сяргеевай, якая бегла на апошнім этапе, змагла прабіцца ў тройку прызёраў.

Перамаглі спартсменкі ФПМ. Іх перамога, як і трэцяе месца дзяўчат факультэта радыёфізікі і электронікі, тлумачыцца моцным і роўным саставам.

Сёмай прыняла эстафету Алена Данільчанка. Чэмпіёнка універсітэта прадэманстравала сваё майстэрства, змагла абысці трох лыжніц і вывесці каманду журфака на чацвёртае месца.

У хлопцаў да апошняга этапа пераможцу не называлі. Спачатку Сяргей Гошка, старшыня спортбюро гістфака, з вялікім адрывам ад сапернікаў перадаў эстафету свайму таварышу. На другім этапе ўперад выйшла каманда ФПМ. Апошнім у ФПМ выступаў Віктар Баранскі, які і паставіў пераможную кропку. Так і не ўдалося гістфаку святкаваць у гэтыя дні перамогу. У іх актыве тры другія месцы і адно трэцяе. А ў актыве ФПМ — тры першыя і адно трэцяе. Два трэція — у факультэта радыефізікі і электронікі.

Доўгі час трэцімі трымаліся філфакаўцы. Але няўдача на трэцім этапе перакрэсліла іх надзеі на прызавое месца. Мінулагодні чэмпіён, каманда фізфака, была толькі чацвёртай, прычым на першым этапе фізікі ішлі перадапошнімі.

Колькі нечаканасцей! Адны радасна святкуюць перамогу, другія ад пройгрышу не могуць стрымаць слёзы.

Напэўна, застануцца задаволенымі рэзультатамі каманды механіка-матэматычнага і геаграфічнага факультэтаў. З дзесятага на сёмае месца перамясціўся ў турнірнай табліцы журфак.

Зразумела, перажываюць пасля першынства спартсмены фізфака і хімфака, якія нечакана слаба для іх выступілі. А на юрфаку ў гэтым годзе зусім не знайшлося лыжнікаў, і каманда асела на апошнім месцы.

У заключэнне прыводзім табліцу першынства універсітэта па лыжных гонках. Ачкі, набраныя факультэтамі, ідуць у залік спартакіяды.

| | |
|---|---|
| 1. ФПМ | 211 |
| 2. Гістфак | 161 |
| 3. Радыёфізікі і электронікі | 140 |
| 4. Мехмат | 104 |
| 5. Фізфак | 100 |
| 6. Геафак | 96 |
| 7. Журфак | 78 |
| 8. Хімфак | 73 |
| 9. Філфак | 53 |
| 10. Біяфак | 51 |
| 11. Юрфак | 48 |

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш спец. кар.**

**На здымку:** стартуе эстафета.

Фота **П. Дзержановіча.**

## МНАГАБОР'Е ГПА

# Вынікі радуюць

УСЕСАЮЗНЫ КОМПЛЕКС ГПА — аснова ўсебаковага фізічнага развіцця людзей. Для таго, каб выканаць нарматывы на значок комплексу, трэба добра бегаць, плаваць, кідаць гранату, страляць з вінтоўкі, хадзіць на лыжах. Штогод ва універсітэце праводзяцца першынствы па зімоваму і летняму мнагабор'ю ГПА.

У зімовае мнагабор'е ўваходзяць лыжы, стральба і гімнастыка. Звыш ста чалавек удзельнічалі ў першынстве універсітэта, якое закончылася на мінулым тыдні.

**Пасля першага віду — лыж — лідэрства захапілі спартсмены ФПМ. Добрыя вынікі паказалі таксама каманды мехмата, гістфака, фізфака, факультэта радыёфізікі і электронікі. Але для таго, каб перамагчы, неабходна паспяхова выступаць ва ўсіх відах. Каманда ФПМ страляла дрэнна і выбыла з ліку прэтэндэнтаў на перамогу.**

Калі адны факультэты разлічвалі ўзяць ачкі ў лыжных гонках, то іншыя, дзе няма добрых лыжнікаў, спадзяваліся на стральбу. Так, юрыдычны факультэт, дзякуючы поспеху ў гімнастыцы, заняў другое месца. Гістарычны факультэт, нягледзячы на невялікі збой у стральбе, выдатна паказаў сябе ў зале гімнастыкі. Амаль усе хлопцы падцягнуліся на перакладзіне больш за пятнаццаць разоў. Гістфак упэўнена атрымаў перамогу.

Роўнае выступленне каманды мехмата прынесла ёй трэцяе месца. Журналісты за добрыя вынікі ў стральбе сталі чацвёртымі.

Вострая канкурэнцыя разгарэлася ў асабістым першынстве. У юнакоў не было роўных Валерыю Тутаву (фізфак). На жаль, яго не падтрымалі таварышы, і фізфак заняў перадапошняе, дзесятае месца, абышоўшы толькі філфак, у якога спаборніцтвы закончылі ўсяго два чалавекі замест васьмі.

Другім быў Аляксандр Шлёнскі (гістфак) — 87 ачкоў, трэцім — Юрый Бурбіцкі (юрфак) — 79, чацвёртым — Віктар Баранскі (ФПМ) — 74 ачкі.

**У дзяўчат Алена Данільчанка (журфак) да звання чэмпіёнкі універсітэта па лыжах дабавіла чэмпіёнскі тытул у мнагабор'і ГПА. Яе вынік — 87 ачкоў — перавышае нарматыў першага разраду. На пятнаццаць ачкоў ад яе адстала Святлана Сяргеева (гістфак), трэцім прызёрам стала Раіса Пяцько (ФПМ). Трынаццаць чалавек на гэтых спаборніцтвах выканалі нарматыў першага разраду.**

Прыводзім камандныя рэзультаты (у першай калонцы — рэзультат, паказаны камандай у мнагабор'і ГПА, у другой — ачкі, якія ідуць у залік спартакіяды):

| | | |
|---|---|---|
| **1. Гістфак** | **559** | **180** |
| **2. Юрфак** | **505** | **150** |
| **3. Мехмат** | **457** | **120** |
| **4. Журфак** | **431** | **90** |
| **5. Факультэт радыёфізікі і электронікі** | **427** | **80** |
| **6. ФПМ** | **397** | **70** |
| **7. Біяфак** | **361** | **60** |
| **8. Хімфак** | **358** | **50** |
| **9. Геафак** | **346** | **40** |
| **10. Фізфак** | **340** | **30** |
| **11. Філфак** | **70** | **20** |

**М. ДАХДУЛЬ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**



*ПРАЙШЛІ СПАБОРНІЦТВЫ лыжнікаў у прграме гарадской спартакіяды замежных навучэнцаў.*

*120 удзельнікаў — прадстаўнікоў ВНУ, вучылішчаў, тэхнікумаў і ПТВ г. Мінска выйшлі на старт лыжнай гонкі.*

*Паспяхова выступіла каманда універсітэта, якая заняла агульнае 4-е месца.*

*Лепшым у камандзе універсітэта быў Лібор Носек (ЧССР), які ў асабістым заліку заняў трынаццатае месца.*

*НА ЗДЫМКУ: каманда лыжнікаў універсітэта.*

Фота **У. Будая.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
17 сакавіка 1983 г.
Зак. 525. АТ 02125
220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.
Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ